# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

УДК 392:273.2(476.5)

**У.Я. АЎСЕЙЧЫК,** канд. гіст. навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гісторыі і соцыягуманітарных навук
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай,
г. Наваполацк, Рэспубліка Беларусь

*Статья поступила 11.06.2025г.*

## АСАБЛІВАСЦІ РАССЯЛЕННЯ СТАРАВЕРАЎ У ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНІМ РЭГІЁНЕ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТ.[1]

*У артыкуле на аснове архіўных і апублікаваных крыніц разгледжаны асаблівасці рассялення старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі. Прааналізаваны вынікі папярэдніх даследаванняў, якія датычыліся гэтага пытання. Выяўлены месцы пражывання і ахарактарызаваны асноўныя арэалы рассялення стараверскага насельніцтва ў рэгіёне ў другой палове XVIII ст. Прыходзім да высновы, што ў гэты перыяд асноўныя стараверскія арэалы ў рэгіёне фіксаваліся ў межах сучаснага Браслаўскага і Міёрскага раёнаў. Асобныя арэалы былі размешчаны на тэрыторыі сучасных Шаркаўшчынскага і Пастаўскага раёнаў Віцебскай вобласці. У артыкуле ўпершыню ў навуковы зварот уведзены шэраг крыніц, якія адлюстроўваюць раннюю гісторыю старавերства на беларускіх землях.*

**Ключавыя словы:** *стараверы, паўночна-заходняя Беларусь, этнічная гісторыя, асаблівасці рассялення, этнічная група.*

**AUSEICHYK U.J.,** PhD in Hist. Sc., Associated Professor,
Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk
Novopolotsk, Republic of Belarus

## PECULIARITIES OF SETTLEMENT OF THE OLD BELIEVERS IN THE NORTH-WESTERN REGION OF BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE 18TH CENTURY

*In the article on the basis of archival and published sources the peculiarities of settlement of the Old Believers in the north-western part of Belarus are considered. The results of the previous researches that dealt with this question are analysed. The places of residence and the main areas of settlement of the Old Believer population in the region in the second half of the XVIII century are identified and characterised. We come to the conclusion that the main Old Believer areas in the region were fixed within the boundaries of the modern Braslav and Miory districts. Separate areas were located in the territory of modern Sharkawshchyna and Pastavy districts of Vitebsk region. In the article for the first time a number of sources, which show the early history of the Old Believers in the Belarusian lands, are introduced into the scientific turnover.*

[1] Статья публикуется в авторской редакции

***Keywords:*** *old Believers, north-western Belarus, ethnic history, peculiarities of settlement, ethnic group.*

**Уводзіны.** Паўночна-заходні рэгіён Беларусі з'яўляецца адным з важнейшых месцаў кампактнага пражывання староверскага насельніцтва на тэрыторыі краіны. Ён уваходзіць у агульную зону рассялення старавераў, якая ахоплівае сучаснае беларуска-літоўска-латвійскае памежжа і прылеглыя тэрыторыі. Нягледзячы на тое, што ва Усходняй Еўропе гэта адна з самых масавых і значных зон кампактнага рассялення старавераў, пытанні яе фарміравання не ў поўнай ступені вырашаны ў сучаснай гістарычнай навуцы. Асабліва гэта датычыцца беларускай "часткі" рэгіёна. Нягледзячы на наяўнасць даволі значнага аб'ёму даследаванняў па стараверстве паўночна-заходняй часткі Беларусі (гл. падрабязна: [9; 10]) пытанні рассялення старавераў у рэгіёне ў раннія перыяды застаюцца не распрацаванымі.

Гісторыя і асаблівасці рассялення старавераў у паўночна-заходняй Беларусі цікавілі не толькі айчынных навукоўцаў, але і даследчыкаў, якія займаліся вывучэннем старавераў Літвы і Латвіі. Гэта абумоўлена ўжо згаданым вышэй фактам аб уваходжанні памежных беларускіх, літоўскіх і латвійскіх тэрыторый у адну зону кампактнага рассялення старавераў. А таму даследаванні стараверства Літвы і Латвіі рэдка абыходзіліся без аналізу матэрыялаў з памежных беларускіх земляў. Сярод навукоўцаў, якія займаліся вывучэннем ранняй гісторыі стараверства на паўночна-заходніх беларускіх землях, у першую чаргу трэба назваць даследчыцу стараверства Латгаліі А.А. Заварыну, беларускага гісторыка А.А. Гарбацкага, літоўскага гісторыка Г. Паташэнка [12]. Але трэба заўважыць, што апошні амаль не разгледзеў пытанні рассялення старавераў у межах паўночна-заходніх беларускіх земляў у другой палове XVIII ст., засяродзіўшы сваю ўвагу на больш раннім перыядзе.

Першай даследчыцай, якую зацікавілі пытанні рассялення старавераў у рэгіёне, была А.А. Заварына. Яе вывучэнне праблемы пачалося яшчэ ў сярэдзіне XX ст. але найбольш поўна і сістэмна было прадстаўлена ў манаграфіі «Рускае насельніцтва ўсходняй Латвіі у другой палове XIX – пачатку XX ст.» (1986). Перавыданне яе даследавання адбылося ў 2019 г. [4]. Нягледзячы на тое, што асноўная ўвага ў працы была засяроджана на ўласна латгальскіх землях, у ёй знайшлося месца і беларускім. Так, на аснове архіўных крыніц А.А. Заварына выявіла, што пасля ўваходжання Латгаліі ў склад Расійскай імперыі некаторая частка старавераў перасяляецца ў 1780–1790-я гг. з рэгіёна ў раён Браслаў–Міёры–Друя, дзе, па меркаванні даследчыцы, ужо меліся староверскія пасяленні [4, с. 37].

У беларускай гістарыяграфіі пытанні рассялення старавераў у гэтым рэгіёне разгледжаны таксама даволі павярхоўна. У апублікаваных даследаваннях, прысвечаных староверам на беларускіх землях, вельмі мала адведзена ўвагі характарыстыцы першапачатковаму этапу засялення яе паўночна-заходніх тэрыторый у другой палове XVII – XVIII стст. Толькі рэдкія факты прыводзяцца ў даследаванні А.А. Гарбацкага «Стараабраднііцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.» (1999) [2]. У рабоце асноўная ўвага пры выкладанні ранняй гісторыі стараверства засяроджана на аналізе рассялення ў іншых рэгіёнах Беларусі (пераважна ў паўднёва-ўсходнім). Фактычна адзінай згадкай аб староверах у паўночна-заходнім рэгіёне была інфармацыя аб асвячэнні храма ў Відзах Браслаўскага раёна. На аснове звестках з "Дэгуцкага летапісца" А.А. Гарбацкі сцвярджае, што на землях сучаснага Браслаўскага раёна першы староверскі храм быў пабудаваны ў Відзах і благаслаўлены духоўнымі айцамі Філімонам Пятровічам і Сцяпанам Афанасічам у 1764 г. [2, с. 73]. Іншыя факты знаходжання старавераў у межах паўночна-заходняй Беларусі ў другой палове XVIII ст. у даследаванні А.А. Гарбацкага не прыводзяцца і не аналізуюцца.

Яшчэ адзін даследчык В. Грыцкевіч вывучаў масавую міграцыю рускіх на беларускія землі ў другой палове XVIII ст. [3]. Аднак у яго працы толькі вылучаны рэгіёны, адкуль уцякалі рускія сяляне. У той

жа час месцы іх пасяленняў на беларускіх землях ён не выяўляў.

Такім чынам, як бачна з вышэй прыведзенага аналізу, гісторыя стараверства на паўночна-заходніх беларускіх землях у другой палове XVIII ст. вывучана вельмі павярхоўна. Амаль не даследаваны адзін з важнейшых аспектаў гэтай праблематыкі – выяўленне месцаў пражывання і фарміраванне арэалаў рассялення стараверскага насельніцтва ў рэгіёне ў другой палове XVIII ст. А ўлічваючы той факт, што і больш ранні перыяд аказаўся такім жа недаследаваным (падрабязна гл.: [11]), у першую чаргу з-за беднасці крыніц, гэта праблема патрабуе першачарговага вырашэння.

*Мэта* дадзенага артыкула – выяўленне асноўных арэалаў рассялення старавераў у паўночна-заходнім рэгіёне Беларусі ў другой палове XVIII ст.

**Асноўная частка.** Як сведчаць крыніцы, асабліва масавыя ўцёкі сялянаў з Расіі у Рэч Паспалітую назіраюцца менавіта з сярэдзіны XVIII ст. Варта адзначыць, што прычыны перасялення рускіх на беларускія землі не былі абумоўлены толькі рэлігійным фактарам. Як бачна з даследаванняў [2; 3; 4; 12], а таксама аналізу крыніц, важнымі прычынамі ўцёкаў рускіх сялянаў былі і сацыяльна-эканамічныя фактары.

Крыніцы сярэдзіне XVIII ст. фіксуюць звесткі аб масавых уцёках рускіх сялян з памежных рэгіёнаў ў Рэч Паспалітую. Як вынікае з аналізу матэрыялаў, гэтыя ўцёкі набывалі значна большыя маштабы, чым у папярэднія перыяды. Пра гэта сведчаць матэрыялы, у якіх дваране памежных рэгіёнаў Расіі скардзіліся на вялікія маштабы ўцёкаў. Асабліва гэта датычылася Пскоўскай правінцыі. Так, дваране памежнага Апочацкага ўезда ў 1760-я гг. скардзіліся аб масавых перасяленнях “за границу в Польшу” [13, с. 266]. Праўда ў якасці прычын перасялення ўказваліся найперш сацыяльна-эканамічныя фактары: “ибо всем в России живущим крестьянам ведомы польские поведения, что всякий их житель, по их вольности, имеет винную и соляную продажу и что у них набора рекрутского не бывает, равно и сборов, для платежа казенных податей, не происходит” [13, с. 266]. І ўцёкі, як сведчаць паведамленні мясцовага дваранства, адбываліся “не только одиночками или семьями, но и целыми деревнями со всем их имуществом” [13, с. 266]. У гэты ж час таксама скардзіліся на масавыя ўцёкі сялянаў у Рэч Паспалітую і дваране памежнага Востроўскага ўезда Пскоўскай правінцыі Наўгародскай губерні. Па іх меркаванні, гэта сталася таксама па прычыне слабай ахові мяжы: “а к тому их побегу весьма безпрепятственная дорога, потому что хотя против нашего ведомства Островского на учрежденной границе и имеются заставы, точию они распределены редко и военнослужащих на них весьма малое число и те заставы почти все состоят в лесах” [13, с. 277]. Дваране яшчэ аднаго, Пустаржэўскага, уезда таксама скардзіліся на шматлікія ўцёкі сялянаў за мяжу [13, с. 295-299]. Як і дваране Востраўскага ўезда, яны таксама адзначалі дрэнны кантроль на мяжы: “Форпосты, ныне находящиеся по границе, более приносят нам вреда, нежели помощи, тем, что находятся друг от друга в дальнем расстоянии, и то по самому малому числу людей” [13, с. 299]. Асабліва яскрава апісвалі наступствы сялянскіх уцёкаў дваране Вялікалуцкага ўезда ў 1760-х гг., якія адзначалі нават, што “главнейшим предметом всех изнеможений нашего Великолоуцкого уезда дворян есть причиняемые разорения от побегов за польскую границу крестьян” [13, с. 365]. Падобным чынам таксама ахарактарызавалі дваране Таропецкага і Холмскага ўездаў стан сваіх маёнткаў. Яны адзначылі, што “главнейшие нужды наших изнеможений Торопецкого и Холмского уездов дворян по состоянию границы с Польшею в разорении от побегов за польскую границу оных уездов крестьян, кои бегут в Польшу, взбунтовать целыми семьями, а особливо во время рекрутского набора” [13, с. 401].

Варта адзначыць, што перасяленне рускіх старавераў на паўночна-заходнія беларускія землі не спынялася і ў 1770-1790-я гг. Да іх далучыліся і тыя стараверы, што ўжо раней перасяліліся на землі Рэчы Паспалітай. Даследуючы характар міграцыі рускіх на тэрыторыю Рэчы Паспалітай, латвійская даследчыца А.А. Заварына на аснове архіўных дакументаў адзначыла перасяленне

некаторай часткі старавераў з Латгаліі ў рэгіён Браслаў-Міёры-Друя ў 1780-1790-я гг. Па яе меркаванні гэта было выклікана тым, што Латгалія была далучана да Расійскай імперыі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай [4, с. 37]. А таму старавeрам прыйшлося ізноў уцякаць ад расійскіх уладаў на землі Рэчы Паспалітай, якія засталіся пасля першага падзелу.

Калі архіўныя даныя і апублікаваныя крыніцы змяшчаюць не так шмат інфармацыі аб пасяленні стараверaў у паўночна-заходняй частцы Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст., то па наступных перыядах яны больш інфарматыўныя. Значная колькасць даных аб раёнах рассялення стараверскага насельніцтва ў межах рэгіёна фіксуецца менавіта з сярэдзіны XVIII ст.

Так, у тэксце "Дэгуцкага летапісца" (другая яго назва – "Хроногроф Литовский, сиречь Летописец степенный древлеправославного христианства") сустракаюцца ўпамінанні аб пражыванні стараверaў у рэгіёне ў сярэдзіне XVIII ст. Праўда да даставернасці звестак, прыведзеных у гэтай крыніцы, існуюць пэўныя пытанні. Як сведчаць даследаванні, тэкст гэтай крыніцы быў створаны ў сярэдзіне XIX ст. [14, с. 7]. Таму ўзнікае заканамернае сумненне ў дакладнасці звестак, якія датычацца ранняй гісторыі стараверства. Разам з тым, у тэксце "Дэгуцкага летапісца" падзеі ранняй гісторыі (другой паловы XVII – XVIII стст.) стараверства на беларускіх землях амаль не апісваюцца. А падзеі па гісторыі стараверства на сучасных беларускіх землях да сярэдзіны XVIII ст. наогул у ім не згадваюцца. У самім тэксце "Хранографа Літоўскага" ёсць толькі дзве згадкі аб ранняй гісторыі стараверaў на сучасных заходніх беларускіх землях: асвячэнне храма ў Відзах у 1764 г. і пражыванне ў 1749 г. А. Сідарава (Танаева) "с семейством своим" каля г. Друя: "близ города Друи есть весь, именуемая Зачерепье" [14, с. 129]. У другім выпадку ў тэксце крыніцы няправільна паказана назва населенага пункта (павінна быць – "Зачеревье" (бел.: Зачарэўе), сучасны Міёрскі раён). Факт пражывання стараверaў у гэтай вёсцы і акрузе ў сярэдзіне XVIII ст. пацвярджаюць і іншыя крыніцы.

Некаторая інфармацыя аб месцах рассялення стараверaў у рэгіёне ўтрымліваецца ў "Рэестры…"1, якія былі складзены ў 1760-х гг. расійскімі чыноўнікамі. Яго тэкст апублікаваў М.І. Лілееў у сваёй працы "Из истории раскола на Ветке и в Стародубье XVII–XVIII вв." (1895) [6, с. 131-132]. Па сведчанні даследчыка, гэты дакумент быў складзены ў хуткім часе пасля другой "выгнанкі" стараверaў з Веткі у 1764 г. У сваю чаргу Г. Паташэнка лічыць, што дакумент мог быць складзены яшчэ напярэдадні "выгнанкі" [12, с.317]. Ва ўсялякім выпадку, храналагічна гэты дакумент можна аднесці да 1760-х гг. У ім указаны шэраг населеных пунктаў у Браслаўскім павеце, дзе пражывалі староверы, а таксама колькасць іх двароў. У дакуменце згадны наступныя населеныя пункты, якія ўваходзяць у сучасныя межы Беларусі: "В повете Бреславском во владении шляхтича Ильзяна: в д. Загорьеве 13, Молявках 15, Коноваловшине 10, Снусках 18, Евтеришках 5, Питкуках 13, Черномордовой 5, Горушке 6, Пустошке 7, Глубошке 5, Черневой 3, Кропишках 7, Заскудье 12" [6, с. 131]. Такім чынам, ў "Рэестры…" згаданы 13 населеных пунктаў у Браслаўскім павеце (маецца на ўвазе толькі тыя, што ўваходзяць у сучасныя межы Беларусі2), у якіх налічвалася 119 стараверскіх двароў. У сучасны перыяд усе гэтыя населеныя пункты размешчаны на тэрыторыі Друеўскага сельсавета Браслаўскага раёна і Перабродзкага сельсавета Міёрскага раёна. Трэба

[1] Поўнасцю дакумент мае наступную назву: "Реестр, сочиненный в волостной описных государевых раскольнических слобод конторе, по разведыванию чрез проезжающих за границу в Польскую область имеющих торговой промысел оных описных слобод обывателей, сколько именно в Польше и за какими владельцами живут в подданстве оставшие от высылки в Россию беглые великороссийские люди, и в каких слободах, сколько дворов осталось" [6, с. 131].

[2] У "Рэестры…" згаданы і населеныя пункты Браслаўскага павета, дзе пражывалі староверы і якія ў сучасны перыяд адносяцца да латвійскіх тэрыторый [6, с. 132].

адзначыць, што гэты рэгіён і ў наступным з'яўляўся адным з масавых і важных месцаў кампактнага рассялення старавераў у рэгіёне.

Важную ролю ў вызначэнні рэгіёнаў рассялення старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі ў другой палове XVIII ст. маюць і матэрыялы "Візітацыі браслаўскага дэканату 1782-1783 гг." [15]. Дзякуючы публікацыі гэтай крыніцы ў 2008 г., яна паступова ўвайшла ў навуковы зварот. У тэксце "Візітацыі" пры характарыстыцы асобных парафій акрамя каталіцкага насельніцтва нярэдка ўказваюцца і іншыя канфесійныя групы, якія іх насялялі. А таму на старонках тэксту сустракаюцца ўпамінанні аб пражыванні старавераў у Браслаўскай, Відзаўскай, Друеўскай, Пагосцкай і Пілiканскай парафіях Браслаўскага дэканату (тэрыторыя сучаснага Браслаўскага і Міёрскага раёнаў). Але, як вынікае з крыніцы, не ва ўсіх гэтых парафіях колькасць старавераў была вялікай. Так, ксёндз Андрэй Ленартовіч паведамляў, што ў Друеўскай парафіі налічвалася каля 50 дамоў стараверaў: "W tejże parafii najdują się filipowce Moskale, lecz dla przechodu ich ustawicznego liczba onych determinować się dokladne nie może, jednak liczyć ich można do piędziesąt domów" [15, p. 278]. Пробашч Ікazненскай парафіі падчас візітацыі 1783 г. данасіў аб вялікай колькасці стараверaў у парафіі. Цэнтрам жа стараверства ён называў в. Зачарэўе: "Sysmatyków, bohomołów, filipowców, Moskalów mieszkających wsiami i zaścienkami bardzo wiele, ledwie nie czwarta część parafii. Ci mają domy po wsiach do modlenia się, osobliwie we wsi Zaczerewiu do starostwa brasławskiego należącej" [15, p. 298]. Ён таксама ўпамінаў пад 1782 г. стараверaў, якія жылі ў в. Радзіеўшчына гэтай парафіі [15, p. 288-289]. У візітацыі за 1783 г. ксёндз Андрэй Ленартовіч згадваў пра даволі значную колькасць стараверaў у Браслаўскай парафіі: "Dyzunitów Moskalów znajduje się w całej parafii brasławskiej do 700 osób" [15, p. 23]. Згодна з Візітацыяй, у Відзаўскай парафіі таксама адзначалася наяўнасці стараверaў, але без маленнай: "Znajdują się też Moskale rozkołowie, ale udzelnych bóżnic nie mają" [15, p. 58]. У сваю чаргу, як адзначалася ў візітацыі, у Пагосцкай і Пілiканскай парафіях стараверaў пражывала мала. Так, у Пагосцкай парафіі "Moskalów bardzo mało liczyć się może" [15, p. 314]. А ў Пілiканскай парафіі, як адзначалася, "Moskalów domów 2" [15, p. 356].

Каштоўнай крыніцай для вызначэння месцаў пражывання стараверaў з'яўляецца таксама "Апісанне парафій Віленскай дыяцэзіі з 1784 г. Т.1. Браслаўскі дэканат" ("Opisy parafii diecezji wileńskiej z 1784 roku T. 1. Dekanat Brasław"). Храналагічна, гэта крыніца адносіцца да таго ж часу, што і "Візітацыя". У дакуменце аўтары часам пазначалі канфесійную прыналежнасць жыхароў тых населеных пунктаў, якія пералічваліся ў "Апісанні". У гэтым дакуменце пры характарыстыцы населеных пунктаў Ікazненскай парафіі (сучасны Браслаўскі раён) яе пробашч Зыгмунд Ластоўскі пазначыў населеныя пункты, дзе пражывалі староверы. Ён указаў наступныя населеныя пункты з пазнакамі "moskalami osadzona", або дзе "Moskale mieszkają": Буеўшчына, Гарушка, Канавалаўшчына, Лугі, Мацяшы, Маляўкі, Оплесы, Укольск, Пустошка, Радзіеўшчына, Турчылава, Вязаўшчына, Відутоўшчына [23, s. 87, s. 90, s. 92-96, s. 98-100].

Важны комплекс крыніц, якія змяшчаюць інфармацыю аб пражыванні стараверaў на той або іншай тэрыторыі, уяўляюць матэрыялы справаводства і гаспадарча-эканамічнага характару. Сярод гэтай групы дакументаў асаблівую цікавасць уяўляюць інвентары XVIII ст. (як архіўныя, так і тыя, што былі ўжо апублікаваныя). Як вынікае з аналізу даных інвентароў, большасць з іх змяшчаюць звесткі аб пражыванні стараверaў толькі ў другой палове стагоддзя і, асабліва, ў апошняй яе трэці.

Перш чым прыступіць да аналізу даных, змешчаных у інвентарах, варта зрабіць некалькі папярэдніх заўваг. Паўстаюць пытанні аб ідэнтыфікацыі стараверaў з ліку іншых перасяленцаў у маёнтку. У сваю чаргу даследчыца латгальскага стараверства А.А. Заварына, аналізуючы матэрыялы інвентара Асуньскага вайтоўства 1695 г. адзначала, што ў ім пражывалі разам з латышамі і беларусамі асобы яўна рускага паходжання. Насупраць іх імёнаў стаяла паметка "захожы" ці "маскаль" [4, с. 25]. Безумоўна, сама даследчыца адзначала, што

выявіць з гэтай групы ўласна старавераў вельмі цяжка, бо значную частку перасяленцаў складалі рускія праваслаўнага веравызнання [4, с. 25, с. 32]. Разам з тым, варта звярнуць увагу і на той факт, што апроч перасяленцаў з Расіі ў першай палове XVIII ст. ішла актыўная ўнутраная міграцыя насельніцтва. Так, П.Г. Казлоўскі разбіраў выпадак з насельніцтвам Сар’янскай воласці Друеўскай латыфундыі. Даследчык адзначаў, што на працягу першай паловы XVIII ст. насельніцтва яе павялічылася больш чым у паўтара разы, галоўным чынам за кошт каланізацыі. У 1753 г. тут налічвалася 11% “захожых” сялянаў. Пры гэтым значная частка іх перамясцілася з беларускіх земляў. Так, частка гэтых перасяленцаў прыбыла з іншых уладанняў Сапегаў, некаторыя перайшлі ад іншых феадалаў. Частка прыбыла таксама з другіх земляў Рэчы Паспалітай: Жамойці, Латгаліі, Курляндыі [5, с. 51-52]. Такім чынам, не ўсіх перасяленцаў і “захожых” у гэты перыяд адназначна варта ідэнтыфікаваць як старавераў. Але разам з тым, пры адсутнасці прамога ўказання на канфесійную прыналежнасць выяўленне старавераў магчыма і праз супастаўленне з данымі іншых крыніц, у тым ліку і больш позніх.

У інвентары фальварку Красоўшчына Браслаўскага павета ад 1779 г. старaверы зафіксаваны ў в. Пузаны (недалёка ад суч. в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на). У інвентары пералічаны наступныя асобы: Трошка Маскаль, Дзяніс Маскаль, Іван Маскаль, Клімка Маскаль, Пяцёха Маскаль) [16, l.1451]. А пры апісанні інвентара маёнтка Германавічы ад 1783 г. Спірыдон Маскаль згаданы як жыхар в. Ластаўкі (цяпер не існуе, зусім не далёка каля в. Германавічы) [8, арк.493-496]. У наступным Германавічы і ваколіцы будуць з’яўляцца адным з цэнтраў старaверства на тэрыторыі рэгіёна.

Значная колькасць стараверскага насельніцтва фіксуецца ў інвентарах маёнткаў на тэрыторыі сучаснага Браслаўскага раёна. Так, згодна з данымі інвентара маёнтку Відзы Лаўчынскія (уладальнік Ян Ваўрэцкі) ад 1780 г., старaверы (згаданы як “Moskale”) пражывалі ў засценках Дацішкі, Любішкі, Заблоцішкі [17, l.979-980]. А ў інвентары Браслаўскага староства (уладальнік Ежы Гільзэн) за 1789 г. старaверы фіксуюцца ў наступных населеных пунктах Укольскага вайтоўства (суч. Браслаўскі р-н, Ахрэмавіцкі с/с): в. Укольск, в. Гайлешы, в. Мацешы, в. Кузьмоўшчына, в. Кіслоўшчына. У ў Залескім вайтоўстве таго ж Браслаўскага павета (суч. Браслаўскі р-н, Плюскі с/с) стараверскае насельніцтва фіксавалася ў вёсках Заеленцы і Апідамы, засценках Марцінішкі і Шпінглішкі [18, l.562-581]. У інвентары Бельмонтаў (уладальнік Ежы Гільзэн) на 1798 г. старaверы зафіксаваны ў в. Ахрэмаўцы, Перамерцы, Самавольцы, Лапяны (суч. Браслаўскі р-н, Ахрэмавіцкі с/с) [19, l.450-455].

Ужо напрыканцы XVIII ст., як сведчаць дакументы, стараверскае насельніцтва утварала значны арэал пасяленняў у ваколіцах возера Снуды (самы поўнач Браслаўскага р-на, Плюскі с/с). Матэрыялы інвентара Плюскага староства (уладальнік Антон Салмановіч) ад 1789 г. паведамляюць аб стараверскім насельніцтве ў в. Свілемесце, засценках Кізлішкі, Ілжышкі, Прынэлішкі, Бандарова (суч. Браслаўскі р-н, Плюскі с/с) [18, l.562-581]. А ў інвентары Заснудскага вайтоўства (уладальнік Вінцэнт Александровіч) на 1795 г. у шэрагу населеных пунктаў былі ўказаны прозвішчы і імёны жыхароў, відавочна рускія. Яны пражывалі ў наступных населеных пунктах: вв. Краснагорка, Астравіты, Шашкішкі, Апанасішкі, Масцішча, Юраны, Лаўнікі, Роўгішкі, Лакіні, засценках Баравішкішкі, Лапатніца, Паснудзі [18, l.145-186]. Такая ж карціна вынікае і з матэрыялаў інвентара Заснудзкага вайтоўства ад 1797 г., у якім згадваюцца відавочна рускія прозвішчы ў гэтых жа населеных пунктах [1, 326-334]. У прадстаўленых крыніцах не пазначана канфесійная прыналежнасць жыхароў гэтых населеных пунктаў. Але ўлічваючы той факт, што некалькі пазнейшыя крыніцы паведамляюць аб значным арэале стараверскіх пасяленняў у гэтым рэгіёне (старaверы якраз і пражывалі ў вышэй названых пасяленнях), то можна меркаваць, што яны ўсё ж былі старaверамі. Больш таго, шэраг з гэтых населеных пунктаў у першай палове XIX ст. былі населены выключна старaверамі.

Для выяўлення арэалаў рассялення стараверaў у межах рэгіёна даволі інфарматыўнымі з'яўляюцца матэрыялы 5-й рэвізіі падатковага насельніцтва Расійскай імперыі 1795 г. Гэтыя матэрыялы даюць нагляднае ўяўленне аб рассяленні і колькасці рускага насельніцтва на беларускіх землях. У матэрыялах канфесійная прыналежнасць фіксуецца не заўсёды. Сустракаецца таксама варыянты "людзі расійскія", "вольныя людзі расійскія", "людзі расійскія, захожыя, вольныя". Улічваючы той факт, што ў іншых ранейшых і больш позніх крыніцах гэтыя "расійскія людзі" вызначаліся як староверы, то і ў гэтых матэрыялах 5-й рэвізіі гаворка, верагодна, ідзе пра іх. У некаторых матэрыялах (рэвізскіх сказках) указаны менавіта яны як староверы ("старообрядцы, именуемые пилипонами").

Так, згодна з матэрыяламі рэвізіі, у Завілейскім павеце староверы на сучасных беларускіх землях пражывалі ў Гадуцішскай, Лынтупскай і Камайскай валасцях. У Гадуцішскай воласці староверы фіксаваліся ў в. Кукляны (сучасны Пастаўскі раён; у наступным адзін з важнейшых цэнтраў староверства ў рэгіёне). На 1795 г. тут налічвалася 7 староверскіх сем'яў (42 чалавекі). Яны пазначаны як "людзі расійскія, захожыя, вольныя". Усяго ў Гадуцішскай воласці зафіксавана было 103 староверы [20, l. 81r-82r]. У той жа час у межах Лынтупскай воласці (сучасны Пастаўскі раён) "расійскіх людзей" налічвалася значна больш. Згодна з данымі 5-й рэвізіі, тут пражывала звыш 250 чалавек. Староверы фіксаваліся ў вёсках Апідамы (таксама адзін з важнейшых цэнтраў староверства), Качанішкі, Масленікі, Глебішкі, Белянішкі, Вейшышкі, Петруці, засценку Падсіўцы [22, l. 19-19r, l.25-26, l.45-48r, l.78r]. На беларускіх землях Камайскай воласці "рускія людзі" фіксаваліся ў вв. Мольдзевічы і Мунцэвічы (сучасны Пастаўскі раён). Аднак іх тут налічвалася ўсяго 36 чалавек [21, l. 27r-28].

Матэрыялы 5-й рэвізіі змяшчаюць таксама інфармацыю аб староверскіх пасяленнях на паўднёвых землях сучаснага Браслаўскага раёна (у той час у межах Пастаўскага павета). Згодна з гэтымі крыніцамі, староверы насялялі наступныя населеныя пункты: вёскі Задворная, Кавалеўшчызна, Кандратова, Домашы, Альбінова, Сіповічы, Станіслаеўшчына, Міхайлішча, засценкі Нікалаеўшчызна, Пруднікі, Качэргі, Ліпы, Старое Альбінова, Бальшчына, Балундзішкі, Зверына, Дворышча [7, арк. 26, арк. 59адв, 61адв, 474адв, 476адв, 478адв, 482адв-485, 486адв, 488адв, 490адв, 492адв-496адв, 498адв, 502адв, 504адв, 506адв-507адв, 510адв-514адв, 516адв-518адв].

Заключэнне. Такім чынам, на аснове аналізу матэрыялаў прыходзім да наступных высноў. Пачынаючы з сярэдзіны XVIII ст. крыніцы пераканаўча сведчаць аб фарміраванні даволі значных арэалаў рассялення стараверaў у межах рэгіёна. Асабліва істотныя яны былі ў межах сучаснага Браслаўскага і сумежнага Міёрскага раёнаў. Асобныя арэалы фіксаваліся на тэрыторыі сучасных Шаркаўшчынскага і Пастаўскага раёнаў Віцебскай вобласці. Такім чынам, ужо напрыканцы XVIII ст. былі сфарміраваны асноўныя арэалы рассялення стараверaў на тэрыторыі паўночна-заходняй Беларусі. Менавіта ў наступныя перыяды яны стануць асноўнымі цэтрамі староверства ў рэгіёне.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Акты Виленской археографической комиссии. – Т. 38: Инвентари староств, имений, фольварков и деревень XVIII в.: (1720–1798). – Вильна : Тип. А.Г. Сыркина, 1914. – IX, 504 с.
2. Гарбацкі, А. А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. / А. А. Гарбацкі. – Брэст : БрДУ, 1999. – 202 с.
3. Грицкевич, В.П. Размеры и причины массовой миграциирусских в Литву и Белоруссию во второй половине XVIII в. (по опубликованным русским источникам) / В.П. Грицкевич // Научные труды высших учебных заведений Литвы. История. – Т.32. – Вильнюс, 1991. – С.53–68.
4. Заварина, А. А. Латгальские староверы. Историко-этнографические очерки разных лет / А. А. Заварина. – Рига: Рижская Гребенщиковская старообрядческая община, 2019. – 368 с.
5. Козловский, П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII–XVIII в.: (по материалам магнатских вотчин) / П. Г.

Козловский. – Минск: Наука и техника, 1969. – 201, [2] с.
6. Лилеев, М.И. Из истории раскола на Ветке и в Стародубье XVII–XVIII вв. / М.И. Лилеев. – Киев: тип. Г.Т. Корчак-Новицкого, 1895. – Вып. 1. – [2], XII, 596 с.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 171.
8. НГАБ. – Ф. 1778. Воп.1. Спр.32.
9. Овсейчик, В.Е. Из истории изучения старообрядчества северо-западной Беларуси: обзор литературы (современный этап) / В.Е. Овсейчик // Slavistica Vilnensis. – 2023. – vol. 68(1). – pp. 102–115.
10. Овсейчик, В.Е. Из истории изучения старообрядчества северо-западной Беларуси: обзор литературы (вторая половина XVIII в.–1980 гг.) / В.Е. Овсейчик// Slavistica Vilnensis. – 2022. – vol. 67(2). – pp. 141–149.
11. Овсейчик, В. Е. К вопросу о расселении старообрядцев в северо-западном регионе Беларуси во второй половине XVII – первой половине XVIII в. / В.Е. Овсейчик // Вестник антропологии. – 2025. – № 1. – С. 337–352.
12. Поташенко, Г. Староверие в Литве: Вторая половина XVII – начало XIX вв. Исследования, документы, материалы / Г. Поташенко. – Вильнюс: Aidai, 2006. – 543 с.
13. Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е.И.В. Канцелярии, 1875. – Т.14. – XX, 544 с.
14. Хронограф Литовский, сиречь Летописец степенный древлеправославного христианства / Подг. Н. Морозовой и Г. Поташенко. – Вильнюс: Вильнюсский университет, 2011. –329 с.
15. Breslaujos dekanato vizitacija 1782–1783 m., atlikta Vilniaus vyskupo Ignoto Jokūbo Masalskio parėdymu / Firkovičius, Romualdas, parengė [edt]. – Vilnius : Katalikų akademija, 2008. – XI, 464 p.
16. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў; LVIA). – F. 46. Ap.1. B. 8.
17. LVIA. – F. 46. Ap.1. B. 9.
18. LVIA. – F. 46. Ap.1. B. 20.
19. LVIA. – F. 46. Ap.1. B. 23.
20. LVIA. – F. 515. Ap.15. B. 42.
21. LVIA. – F. 515. Ap.15. B. 45.
22. LVIA. – F. 515. Ap.15. B. 46.
23. Opisy parafii diecezji wileńskiej z 1784 roku T. 1. Dekanat Brasław / Jodczyk Krzysztof (oprac.). – Białystok, 2009. – 457 s. – URL: http://pbc.biaman.pl/dlibra/doccontent?id=13702.

**References**

1. *Akty Vilenskoj arheograficheskoj komissii. Vol. 38: Inventari starostv, imenij, fol'varkov i dereven' XVIII v.: (1720–1798)* [Acts of the Vilna Archaeographical Commission. Vol. 38: Inventories of starostvos, estates, folvarks and villages of the 18th century: (1720-1798)]. Vil'na, Tip. A.G. Syrkina, 1914, IX, 504 p. (In Russian)
2. Garbatski A. A. *Staraabradnitstva na Belarusi u kantsy XVII – pachatku XX st.st.* [Old Believers in Belarus in the late XVII – early XX centuries]. Brest, Brest. Derzhavnij Universitet, 1999, 202 p.
3. Grickevich V.P. Razmery i prichiny massovoj migraciirusskih v Litvu i Belorussiyu vo vtoroj polovine XVIII v. (po opublikovannym russkim istochnikam) [Dimensions and reasons for mass migration of Russians to Lithuania and Belorussia in the second half of the 18th century (according to published Russian sources)]. *Nauchnye trudy vysshih uchebnyh zavedenij Litvy. Istoriya* [Scientific works of Lithuanian higher educational institutions. History]. Vol. 32, Vil'nyus, 1991. P.53–68 (In Russian)
4. Zavarina A. A. *Latgal'skie starovery. Istoriko-etnograficheskie ocherki raznyh let* [Latgalian Old Believers. Historical and ethnographic sketches of different years]. Riga, Rizhskaya Grebenshchikovskaya staroobryadcheskaya obshchina, 2019, 368 p. (In Russian)
5. Kozlovskij P. G. *Krest'yane Belorussii vo vtoroj polovine XVII–XVIII v.: (po materialam magnatskih votchin)* [Peasants of Belorussia in the second half of the XVII-XVIII centuries: (on the materials of magnate fiefdoms).]. Minsk, Nauka i tekhnika, 1969. 201, [2] p. (In Russian)
6. Lileev M.I. *Iz istorii raskola na Vetke i v Starodub'e XVII–XVIII vv.* [From the History of the Schism on Vetka and in Starodubye of the XVII-XVIII cc.]. Kiev, tip. G.T. Korchak-Novickogo, 1895. Vol. 1, [2], XII, 596 p. (In Russian)

7. *Nacyyanal'ny gistarychny arhiu Belarusi* [National Historical Archive of Belarus]. – F. 333. Vop. 9. Spr. 171.
8. *Nacyyanal'ny gistarychny arhiu Belarusi* [National Historical Archive of Belarus]. – F. 1778. Vop.1. Spr.32.
9. Ovseichik V. E. Iz istorii izucheniia staroobriadchestva severo-zapadnoi Belarusi: obzor literatury (vtoraia polovina XVIII v.– 1980 gg.) [From the History of the Study of Old Believers in Northwestern Belarus: A Review of the Literature (Second Half of the 18th Century–1980)]. *Slavistica Vilnensis*, 2022, no. 67(2), pp. 141–149. (In Russian)
10. Ovseichik V. E. Iz istorii izucheniia staroobriadchestva severo-zapadnoi Belarusi: obzor literatury (sovremennyi etap) [From the History of the Study of Old Believers in Northwestern Belarus: Review of the Literature (Current Stage)]. *Slavistica Vilnensis*, 2023, no. 68(1), pp. 102–115. (In Russian)
11. Ovseichik V. E. K voprosu o rasselenii staroobryadcev v severo-zapadnom regione Belarusi vo vtoroj polovine XVII – pervoj polovine XVIII v. [To the question about the settlement of the Old Believers in the north-western region of Belarus in the second half of the XVII – first half of the XVIII century] *Vestnik antropologii*. 2025, no. 1. P. 337–352. (In Russian)
12. Potashenko G. *Staroverie v Litve: vtoraia polovina XVII – nachalo XIX vv. Issledovaniia, dokumenty i materialy* [Old Belief in Lithuania: Second Half of the 17th – early 19th Centuries. Research, Documents, Materials]. Vilnius, Aidai, 2006, 543 p. (In Russian)
13. *Sbornik Imperatorskogo Russkogo Istoricheskogo Obshchestva* [Collection of the Imperial Russian Historical Society]. SPb., Tip. 2-go Otd-niya Sobstv. E.I.V. Kancelyarii, 1875. Vol.14, XX, 544 p. (In Russian)
14. *Hronograf Litovskij, sirech' Letopisec stepennyj drevlepravoslavnogo hristianstva* [The Lithuanian Chronographer, the Chronicler of the Steppe of Old Orthodox Christianity]. Eds. N. Morozovoj, G. Potashenko. Vil'nyus, Vil'nyusskij universitet, 2011, 329 p. (In Russian)
15. *Breslaujos dekanato vizitacija 1782–1783 m., atlikta Vilniaus vyskupo Ignoto Jokūbo Masalskio parėdymu.* Eds. Firkovičius, Romualdas, parengė [edt]. Vilnius: Katalikų akademija, 2008, XI, 464 p.
16. *Lietuvos valstybės istorijos archyvas* (LVIA). – F. 46. Ap.1. B. 8.
17. LVIA. – F. 46. Ap.1. B. 9.
18. LVIA. – F. 46. Ap.1. B. 20.
19. LVIA. – F. 46. Ap.1. B. 23.
20. LVIA. – F. 515. Ap.15. B. 42.
21. LVIA. – F. 515. Ap.15. B. 45.
22. LVIA. – F. 515. Ap.15. B. 46.
23. *Opisy parafii diecezji wileńskiej z 1784 roku T. 1. Dekanat Brasław.* Eds. Jodczyk Krzysztof (oprac.). Białystok, 2009. 457 s. Available at: http://pbc.biaman.pl/dlibra/doccontent?id=13702 (accessed: 18.05.2025).

*Received 11.06.2025*